✓ Круглы стол **«“Сцежкамі...” Міхася Зарэцкага»** прайшоў **18 лістапада** ў прэс-цэнтры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. 20 лістапада – 120 гадоў з дня нараджэння гэтага пісьменніка, крытыка і перакладчыка, расстралянага ў чорную ноч у Курапатах. Мерапрыемства транслявалася ў прамым эфіры на YouTube-канале бібліятэкі і даступнае ў запісе. Удзельнічалі даследчыкі літаратуры, прадстаўнікі архіваў і музеяў, бібліятэк і выдавецтваў. Творы Міхася Зарэцкага (Касянкова) заўсёды карысталіся вялікім попытам чытачоў. Вядомыя факты, калі яго кнігі выносілі з бібліятэк, выкрадалі з шафаў, вырывалі найбольш цікавыя старонкі.

Напярэдадні ў НББ адкрыліся дзве кніжныя выставы. **«Небасхіл паэзіі Алеся Каско»** прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння паэта і перакладчыка, які шмат разважаў пра сэнс жыцця, штодзённасць і вечнасць. **«Паэзіі святло зямное»** прымеркаваная да 90-годдзя беларускага паэта, драматурга, публіцыста, крытыка, перакладчыка Анатоля Вярцінскага.